# Адкрыццё школы

2 верасьня 1996 г. у новай пачатковай школе ў Кляшчэлях адбылося ваяводзкае ўрачыстае адкрыццё навучальнага году 1996/1997.

Доўга чакалі кляшчэлеўскія школьнікі і настаўнікі гэтай школы. Дагэтуль навучаньне вялося ў вельмі прымітыўных абставінах, у старых драўляных будынках без аніякага абсталяваньня.

Даволі доўгая і складаная таксама гісторыя пабудовы новай школы. У 1987 г. пачалася пабудова гміннага асяродку культуры. Будавалі яго грамадзкім чынам. Якраз настаў час бурлівых зьменаў у краіне. На кляшчэлеўскую гаспадарку гэтыя зьмены паўплывалі вельмі адмоўна. Заняпалі ўсе найбуйнейшыя тутэйшыя прадпрыемствы. У 1991 г. тагачасная Гмінная рада вырашыла перадаць згаданы будынак на школу. Спачатку гміна будавала яе сама. У 1993 г. пабудову падтрымалі фінансава беластоцкая Кураторыя асьветы і Міністэрства нацыянальнай адукацыі. Міністэрства выдзеліла грошы з фонду, прызначанага на пабудову школ для нацыянальных меншасьцяў, зыходзячы з прынцыпу, што школа будзе служыць перш за ўсё беларускай моладзі.

І вось новая школа ўжо ёсьць. Няма пакуль што гімнастычнай залы, але яе пабудова ўжо пачалася. У школе, акрамя клясавых кабінэтаў, знаходзіцца вялікая аўдыторыя, якая будзе скарыстоўвацца таксама для культурных мерапрыемстваў, арганізаваных у горадзе. У будынку памесьціцца таксама гмінная бібліятэка і самаўрадавы садзік (прадшкольле).

На адкрыццё прыйшло многа гасьцей, у тым ліку пасол Рэспублікі Беларусь Віктар Бурскі. Школу высьвяцілі мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Васілі і ардынары Драгічынскай каталіцкай дыяцэзіі біскуп Антоні Дыдыч. Апрача прамоваў, сабраныя ў аўдыторыі жыхары гораду і госьці маглі паглядзець выставу працаў Тамары Тарасевіч і ўбачыць патрыятычны мантаж у выкананьні школьнікаў. Вучні прасьпявалі таксама дзьве беларускія песьні: “Мамачка” і “Шэры кот”.

Беларускую мову будуць вывучаць 68 вучняў зь ліку 278 школьнікаў, г. зн. 25%. Навучаць ёй будзе сп. Ірына Тамашук, настаўніца, якая разам з вучнямі перайшла са зьліквідаванай школы ў Палічнай. Кабінэт беларускай мовы будзе супольны з кабінэтам польскай мовы. Ёсьць падручнікі, крыху беларускіх кніжак для школьнай бібліятэкі падарыў пасол Бурскі.

Дырэктара школы Ежы Якубоўскага я спытаў пра чуткі аб увядзеньні з гэтага году вывучэньня ўкраінскай мовы. Аказваецца, некаторыя бацькі спрабавалі сабраць групу ахвотных, але такіх не знайшлося. Такім чынам, навучаньне ўкраінскай мове ў Кляшчэлях не ўдалося аднавіць.

Пішу гэта бязь лішняга трыюмфалізму. Лёс навучаньня беларускай мове ў гэтай школе залежыць перш за ўсё ад актыўнасьці беларусаў, а не чыёсьці няўдачы. Пабудова школы ў Кляшчэлях неаднойчы ўспаміналася ва ўрадавых польска-беларускіх размовах як паралельная з пабудовай польскай школы ў Горадні. Варта паклапаціцца, каб навучаньне беларускай мове замацавалася ў школе, якая столькі скарыстала на беларушчыне.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1996. 15 верасьня. № 37. С. 1, 5.